**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# КАВЫЛЬ МІХАСЬ (ЛЕШЧАНКА ЯЗЭП КАЗІМІРАВІЧ)

**ПАЭТ, КРЫТЫК, ПРАЗАІК**

**1 СНЕЖНЯ 1915 Г. – 6 КРАСАВІКА 2017 Г.**

**ФОНД № 504**

**ВОПІС № 1**

**1931–1990 гг.**

**МІНСК 2021**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1** **ф. 504**

| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ М. КАВЫЛЯ | 1-16 | 1-2 |
| 2. | ПЕРАПІСКА М. КАВЫЛЯ | 17-20 | 2-3 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ М. КАВЫЛЯ І ПРА ЯГО | 21-34 | 3-4 |
| | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Кавыль Міхась** (сапр. **Лешчанка Язэп Казіміравіч**) нарадзіўся 01.12.1915 г. у в. Покрашава (сёння Слуцкі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Акрамя Міхася, у сям'і было чацвёра дзяцей. Бацька загінуў у час Першай сусветнай вайны. Вучыўся ў Грэскай сямігодцы, пасля ў Грозаўскай, а потым зноў у Грэскай, якую скончыў у 1930 г. У 1930–1933 гг. вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме г. Мінска. 23 лютага 1933 г. арыштаваны і асуджаны на тры гады за "удзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі Саюз вызвалення Беларусі (СВБ)". Пакаранне адбываў на Далёкім Усходзе ў 4-м аддзяленні Дальлагу АГПУ на будаўніцтве воднай сістэмы "Сяданбуд". У 1936 г. датэрмінова вызвалены. Пасля вызвалення вярнуўся дадому, але жыць тут не дазволілі, бо вёска знаходзілася ў прыгранічнай паласе. Жыў у г. Варонежы (1936–1938 гг.), дзе вучыўся ў педагагічным інстытуце на вячэрнім аддзяленні літаратурнага факультэта, працаваў на машынабудаўнічым заводзе «Камінтэрн», настаўнічаў. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў мабілізаваны ў Чырвоную армію. Ваяваў на Украінскім фронце артылерыйскім разведчыкам. У 1942 г. пад г. Харкавам трапіў у нямецкі палон. Зімою 1943 г. быў вызвалены. Працаваў у аддзеле прапаганды ў г. Мінску. Ад 1944 г. – на эміграцыі. Затрымаўся ў Баварыі. Пасля працаваў на авіязаводзе ў г. Цытаў і г. Троен. У 1947 г. завербаваўся на вугальныя шахты ў Бельгіі (г. Ля Лювер). Пасля шасці месяцаў працы вярнуўся ў Нямеччыну ў лагер ДП (перамешчаных асоб) г. Натэрнберг (1948), затым перабраўся ў беларускі лагер у г. Бакнанг. Тут рэдагаваў газету "Беларускае слова", а пазней – "Беларускую трыбуну". У сакавіку 1950 г. выехаў у ЗША, пасяліўся ў Саўт-Рыверы, штат Нью-Джэрсі. Працаваў прыбіральнікам у фірме "Squibb", ткачом у Баўнд-Бруку, у аўтамабільнай кампаніі "Ford" і інш.). У 1950-х гг. браў актыўны ўдзел у працы Беларускага кангрэсавага камітэту Амерыкі.

Літаратурнай творчасцю М. Кавыль пачаў займацца рана. Першы свой верш "Лён" напісаў у 1929 г. і ў гэтым жа годзе пачаў друкавацца (верш "Гудкі", апублікаваны ў газеце "Беларуская вёска"). Супрацоўнічаў з часопісамі "Вясна" і "Маладняк". Быў сябрам літаратурнага згуртавання "Маладняк". У 1931 г. друкаваўся ў літаратурным дадатку "Вясна" бабруйскай абласной газеты "Камунар" і ў "Піянеры Беларусі", у 1942–1944 гг. – у газеце "Раніца", затым, у эміграцыі, у часопісах "Беларуская думка", "Конадні", "Шыпшына", газетах "Бацькаўшчына" і "Беларус", зборніку "Ля чужых берагоў" (Мюнхен, 1955). Выдаў зборнікі паэзіі "Ростань" (Рэгенсбург, 1947), "Пад зорамі белымі" (Нью-Ёрк, 1954), "Першая рана" (Манчэстэр, 1960), "Цяжкія думы" (ЗША, 1961), "Міжагнёўе" (Нью-Ёрк, 1990). Выкарыстоўваў псеўданімы: В'юрок, А. Зарэцкі, Я. Ляшчына, Язэп Маёвы. Першы ў беларускай літаратуры стварыў вянок і карону санэтаў ("Цяжкія думы", "Мярэжа", "Чорны лёд"). Тэматыка і праблематыка яго творчасці найперш звязана з Бацькаўшчынай, яе гісторыяй, мовай, культурай.

Напісаны цыкл турэмных вершаў, а таксама вершы, прысвечаныя рэпрэсаваным беларускім пісьменнікам, сябрам-пісьменнікам, з якімі разам падзяляў пакуты выгнання. У паэмах “Пад небам Случчыны каханай” (1943), “Міжагнёўе” (1982) стварыў нетрадыцыйную панараму жыцця ў Савецкай Беларусі і ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Займаўся перакладамі, быў рэдактарам часопіса “Беларуская думка”, пісаў публіцыстычныя і крытычныя артыкулы, рэцэнзіі, апавяданні. На многія вершы паэта напісаны песні (К. Барысавец, Дз. Верасаў, Э. Зубковіч, А. Карповіч, М. Куліковіч, Ю. Рымко).

Міхась Кавыль памёр 6 красавіка 2017 г., пахаваны на беларускіх могілках ў Саўт-Рыверы, штат Нью-Джэрсі, ЗША.

Дакументы М. Кавыля былі перададзены ў БДАМЛМ Вітаўтам Кіпелем у 1998 г. Матэрыялы былі сабраны ў часе падрыхтоўкі да выдання Беларускім інстытутам навукі і мастацтва збору выбраных твораў пісьменніка “Міжагнёўе” ў 1990 г.

У выніку навукова-тэхнічнай апрацоўкі быў складзены вопіс № 1 у колькасці 34 адзінак захоўвання (160 дакументаў) за 1931–1990 гг.

Вопіс складаецца з трох раздзелаў. У першы раздзел “Рукапісы М. Кавыля” ўвайшлі паэмы, вершы, апавяданні, артыкулы, успаміны, п’есы і інш. Справы сістэматызаваны па жанрах, а ўнутры – па храналогіі за 1931–1990 гг.

Другі раздзел “Перапіска М. Кавыля” склалі пісьмы М. Кавыля да В. і З. Кіпеляў, Л. Юрэвіча і пісьмы А. Вініцкага, А.Т. Каханоўскага, В.А. Селяха-Качанскага да М. Кавыля. Справы сістэматызаваны па храналогіі за 1968–1990 гг.

Трэці раздзел “Дакументы М. Кавыля і пра яго” ўключае асабістыя дакументы М. Кавыля (заява на ўступленне ў літ. аб’яднанне “Шыпшына”, запрашэнне на вяселле); артыкулы пра М. Кавыля; матэрыялы, падрыхтаваныя З. Кіпель да збору твораў М. Кавыля “Міжагнёўе”, і прадмова Т. Бёрда да гэтага збору; фатаграфіі М. Кавыля, індывідуальныя і ў групе з Ю. Віцьбічам, У. Сядурам, Л. Юрэвічам. Справы сістэматызаваны тэматычна і па храналогіі за 1946–1990 гг.

Прадмову склала Г.Б. Багамолава
Вядучы архівіст
2021

Беларускі дзяржаўны архіў-музей
літаратуры і мастацтва

ЗАЦВЕРДЖАНА
Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 15.06.2021
№ 8

ФОНД № 504
ВОПІС № 1
1931-1990

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ М. КАВЫЛЯ** | | | | |
| 1 | "Адна ноч у Чарніцах", "Жаўрук", "Недабітыя рыцары", "Непакорныя". Паэмы. Машынапіс з праўкай, ксеракопіі | 1947-1955, 1982-1989 | 50 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 2 | "Чорны лёд". Вянок санетаў. Машынапіс | 1958 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 3 | "Ростань". Зборнік вершаў. Друкаванае выданне | 1947 | 23 | 1 | |
| 4 | "Міжагнёўе". Падборка вершаў да зборніка, падрыхтаванага З. Кіпель. Ксеракопіі | 1990 | 64 | 1/40 | |
| | * * * | | | | |
| 5 | Язэп Маёвы. "З прастораў", "Расьцьвітуць сады". Вершы. Ксеракопія з часопіса "Маладняк" | 1931 | 4 | 2 | |
| 6 | "Беларусь", "Веяў вецер буйны", "За што?", "Новы год" і інш. Вершы надрукаваныя ў Мінскіх выданнях. Газета "Наша слова" № 3 за 1990 г., ксеракопія з часопіса "Бярозка", святлакопіі з газеты "Голас вёскі" | 1943-1990 | 14 | 6 | |
| 7 | "Вечар", "Мне цыганка варажыла", "Муза", "Ня шукай", "О, матуля мая, Беларусь", "Песьня-кліч". Вершы. Ксеракопіі з газеты "Бацькаўшчына" і часопіса "Шыпшына" (Германія) | 1945-1957 | 20 | 19 | |
| 8 | "Беларусы, беларусы!", "Гумар", "Дайце "гевэр", "Крывія" і інш. Вершы. | 1947-1955, 1990 | 8 | 11 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 9 | "Беларусь", "Галгофа", "Праўды слова", "Першы сьнег", "Слаўны мой род" і інш. Вершы, надрукаваныя ў перыядычных выданнях ЗША. Выразка з газеты "Беларуская трыбуна", ксеракопіі з газеты "Беларускае слова", часопіса "Беларуская думка" і інш. | 1949-1988 | 14 | 20 | |
| 10 | "Навагодняе". Вершаваны сямейны фельетон. Машынапіс | 1972 | 5 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 11 | "Расплата" (пад псеўд. А. Зарэцкі), "Сполах". Апавяданні. Газета "Беларускае слова" і ксеракопія з яе | 1949, 1950 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 12 | "Белорусы и литовцы", "Вторая ловушка", "Глубже и шире!", "Звонят колокола Хатыни...", "Повторение истории?", "Расстрел польских офицеров", "Узник Седанлага" і інш. Артыкулы. Ксеракопіі і святлакопія з газеты "Новое русское слово" (ЗША) | [1970]-1977 | 15 | 15 | |
| 13 | "Мой шлях"="Трошкі аб сабе"="Коратка пра сябе". Успаміны. Варыянты. Машынапіс і ксеракопія з праўкай | 1988-1990 | 28 | 4 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | "Недасьпяваная песьня". П'еса. Ксеракопія з праўкай | 1957 | 43 | 1 | |
| 15 | "Лясная казка". П'еса. Машынапіс | 1967 | 10 | 1 | |
| 16 | "Марыльчына знаходка". П'еса. Ксеракопія машынапісу | [1960-я гг.] | 16 | 1 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА М. КАВЫЛЯ** | | | | |
| 17 | Пісьмы М. Кавыля да В. і З. Кіпеляў. Да аднаго з пісем прыкладзена фатаграфія М. Кавыля. Л. 2 | 1987-1990 | 18 | 18 | |
| 18 | Пісьмы М. Кавыля да Л. Юрэвіча | 1996 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | * * * | | | | |
| 19 | Пісьмы А. Вініцкага (г. Лос-Анджэліс, ЗША) М. Кавылю з просьбай даслаць звесткі аб сваёй працы ў Саюзе Беларускай Моладзі ў Нямеччыне для кнігі "Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне ў 1939-1951 гадох" | 1968-1969 | 3 | 3 | |
| 20 | Пісьмы Т. Каханоўскага, В.А. Селяха-Качанскага М. Кавылю | 1972, 1983 | 3 | 2 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ М. КАВЫЛЯ І ПРА ЯГО** | | | | |
| 21 | Заява М. Кавыля на ўступленне ў літаратурнае згуртаванне "Шыпшына" | 1946 | 1 | 1 | |
| 22 | Запрашэнне ад М. Кавыля і З. Вяргун на іх вяселле на імя А. Асіпчыка | 1953 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 23 | Я. Золак. "Жыццёвы і творчы шлях Міхася Кавыля". Артыкул да 50-годдзя з дня нараджэння. Ксеракопія з часопіса "Беларуская думка" (ЗША) | 1966 | 2 | 1 | |
| 24 | Г. Шаўчук (Ю.У. Шавялёў). "Два поэти". Артыкул пра М. Кавыля і М. Сяднёва. Ксеракопія з газеты "Час" № 48, 1947 г. | | 3 | 1 | |
| 25 | Неўстаноўлены аўтар. Артыкул пра М. Кавыля і рэцэнзія на яго зборнік вершаў "Пад зорамі белымі". Ксеракопіі | 1955, 1959 | 3 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 26 | Неўстаноўлены аўтар. "Грэх на сэрцы цяжкі". Верш, які быў надрукаваны ў газеце "Голас Радзімы" пад імем М. Кавыля. Машынапіс | 1960 | 2 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 27 | "Альфабэтны паказьнік" твораў М. Кавыля і нататкі для збору твораў "Міжагнёўе" (Нью-Ёрк), падрыхтаваныя З. Кіпель. Варыянты. Аўтограф, машынапіс | 1990 | 61 | 4 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 28 | Бібліяграфія твораў М. Кавыля і чарнавыя запісы да яе.<br>Аўтограф, машынапіс | 1990 | 31 | 3 | |
| 29 | [З. Кіпель]. "Вобраз месяца ў паэзіі Міхася Кавыля". Нататкі і чарнавыя запісы для дакладу.<br>Аўтограф | 1990 | 23 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 30 | Т. Бёрд. "Preface". ("Прадмова") да збору выбраных твораў М. Кавыля "Міжагнёўе". На англійскай мове. Варыянты.<br>Машынапіс з праўкамі, ксеракопія | 1990 | 11 | 2 | |
| 31 | Заўвагі А. Адамовіча да біяграфіі М. Кавыля "Коратка пра сябе".<br>Аўтограф | 1990 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 32 | Пісьмо М.Ю. Прускага В. Кіпелю | 1990 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 33 | Фатаграфіі М. Кавыля, індывідуальныя | 1947, 1952 | 2 | 2 | |
| 34 | Фатаграфіі М. Кавыля ў групе з Ю. Віцьбічам, У. Сядурам, Л. Юрэвічам | 1952, 1999 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 34 (трыццаць чатыры)

спраў з № 1 па № 34 , 144 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

вядучы архівіст Г.Б. Багамолава

2021

Дакументы прынялі:

заг. аддзела забеспячэння
захаванасці дакументаў В.І. Бярэйшык

"_____"____________20____ г.